14. *Татищев В. Н.* Собрание сочинений: в 8 т. / В. Н. Татищев. – М.: Научно-издательский центр «Ладомир», 1994–1996. – Т. 2–3: История Российская. Часть вторая. – 688 с.
15. *Халиков А. Х.* Монгольское нашествие и судьба Великого города / А. Х. Халиков // Археологические памятники Нижнего Прикамья: сб. науч. ст. – Казань, 1984. – С. 82–98.
16. *Халиков А. Х.* Основные этапы монгольского нашествия на Волжскую Булгарию / А. Х. Халиков, И. Х. Халиуллин // Волжская Булгария и монгольское нашествие: сб. науч. ст. – Казань, 1988. – С. 4–22.
17. Холмогорская летопись. Двинской летописец // Полное собрание русских летописей. – Т. 33. – 1-е изд. – Л.: «Наука», 1977. – 251 с.
18. *Хузин Ф. Ш.* Исследования внутренней линии обороны Билярского городища / Ф. Ш. Хузин, М. М. Кавеев // Военно-оборонительное дело домонгольской Булгарии: : сб. науч. ст. – Казань, 1985. – С. 41–57.
19. *Хузин Ф. Ш.* Укрепления внешней линии обороны Билярского городища (к вопросу о времени возникновения и этапах строительства) / Ф. Ш. Хузин // Военно-оборонительное дело домонгольской Булгарии: : сб. науч. ст. – Казань, 1985. – С. 58–90.


## ТЭМА КОСМАСУ Ў МАСТАЦТВЕ ЯЗЭПА ДРАЗДОВІЧА


**Т. В. Пецюкевіч**


*«Люблю тое, у што веру, а веру ў тое, што люблю»*
*Язэп Драздовіч*

З даўніх часоў чалавек углядаўся ў неабсяжную нябесную прастору. Яго прываблівалі Сонца, Месяц і зоркі, якія складваліся ў неверагодныя камбінацыі – сузор'я. Чалавек марыў навучыцца лётаць і, канешне, быў упэўнены, што ён не адзін ў Сусвеце.

Мінулі стагоддзі, але чалавецтва зрабіла толькі маленькі крок на шляху пазнання неабсяжнай касмічнай прасторы. Пакуль што ніхто не здолеў знайсці доказы існавання іншапланетнага жыцця. Існуе вялікая колькасць гіпотэз і меркаванняў, і нават самыя неверагодныя з іх павінны даследвацца, бо менавіта яны могуць аказацца рэальнасцю.

Адна з такіх канцэпцый належыць Язэпу Драздовічу – беларускаму мастаку, пісьменніку, этнографу і астраному-аматару. Свае погляды Драздовіч прадставіў уласнымі навуковымі працамі, запісамі ў дзённіку, графічнымі альбомамі і яскравым жывапісам. Менавіта касмічныя палотны з'яўляюцца найбольш цікавым аспектам мастацкай спадчыны беларускага Леанарда да Вінчы. Увогуле Драздовіч – гэта пачынальнік тэмы космасу ў беларускім мастацтве.

Касмічнай тэме ў творчасці Драздовіча прысвечаны асобныя артыкулы некаторых беларускіх даследчыкаў: Г.Горавай, Н.Усавай, Г.Каржанеўскай, Л.Міхневіч. Але амаль ніхто з іх не разглядаў космас

Драздовіча ў кантэксце еўрапейскага і рускага жывапісу п.п. XX ст., таму адной з мэт маёй работы – гэта з дапамогай параўнальнага аналіза паказаць самабытнасць Драздовіча ў трактоўцы касмічнай тэмы.

Крыніцай для мастацкіх і навуковых распрацовак Драздовіча былі яго сны, якія мастак ў сваім дзённіку называў «касмічнымі візіямі». Сам Драздовіч лічыў, што валодае ўнікальнай здольнасцю – падарожнічаць, «лётаць у снах», пераносіцца з нашай рэальнасці на бліжэйшыя планеты. Усё пабачанае ў снах мастак падрабязна занатоўваў і замалеўваў. З гэтых замалёвак і нараджаліся яго касмічныя палотны. Акрамя мастацкіх твораў, Драздовіч распрацаваў уласную касмалагічную тэорыю «О происхождении самовертящихся планет Солнечной системы» (1952), яму належыць рукапісныя манаграфіі «Дзе мы і хто мы» (1937–1938), «Тэорыя рухаў у касмалагічным значэнні» у чатырох частках (1948–1950) і яшчэ некалькі работ, прысвечаных касмічным працэсам і планетам Сонечнай сістэмы [3, с. 170].

Вядома больш за 100 твораў Драздовіча на касмічную тэму. Большасць з іх была створана ў перыяд з 1930 па 1934 год. Драздовічу належуць 3 серыі карцін на тэму космасу: «Жыццё на Марсе» (1931), «Жыццё на Сатурне» (1932), «Жыццё на Месяцы» (1932). [2, с.97]

Настрой твораў Язэпа Драздовіча самы розны. Часам сонечны і урачыста-велічны, часцей – змрочны і жудасны. Ён – адлюстраванне тых працэсаў, што адбываюцца на зямлі.

Чырвоны Марс для мастака не ваяўнічая планета. Жыхары яго («педагогі») выглядаюць дабрадушнымі, вось толькі апрануты яны ва ўніформу, нібыта зняволеныя, а іх цалкам аднолькавыя дамы на тэрасах без прыкмет якой бы то ні была архітэктуры нагадваюць рабочы мурашнік, пчаліныя соты ці нават баракі канцлагера пад ясным сонцам.

У сваіх візіянерскіх творах Драздовіч часта ўжывае асаблівы прыём, які надае выявам характар прывіду. Напрыклад, аркуш «Марсіянін-педагог жоўта-бронзавай расы» намаляваны даўгімі паралельнымі штрыхамі, а не сілуэтнай лініяй. Контур адсутнічае, што дае адчуванне кораткаімгненнасці візіі. [1, с. 25]

Бязлюднымі выглядаюць пейзажы Сатурна, любімай драздовічскай планеты, якую сам мастак лічыў самай цікавай і загадкавай. Але і тут прысутнічае тэндэнцыя к нарастанню трывожнасці. Сонечны «Падкружніковы краявід на планеце Сатурн», які ззяе яркім блакітам нябёсаў, змяняе злавесны «Знак паперэджання перад безданню» з чарапамі.

Самай распрацаванай тэорыяй іншапланетнага жыцця ў Драздовіча з'яўляецца канцэпцыя жыцця на Месяцы. Погляды мастака прадстаўлены графічнымі альбомамі з накідамі і замалёўкамі,

жывапіснымі творамі і запісамі ў дзённіку. Драздовіч стварыў падрабязную карту Месячнай паверхні, а таксама апісаў некаторыя аспекты месячнага жыцця: стан гарадоў, архітэктуры, асаблівасці флоры і фаўны. Лінейны накід панарамы горада Трывеж паслужыў асновай для напісання палатна «Трывеж. Панарама месячнага горада» (1932–33).

У 1933 годзе ствараецца альбом «Жыццё на Месяцы» – самы трывожны і змрочны з усёй серыі. На звыклым для людзей спадарожніку Зямлі Драздовіч бачыць дзіўныя гарады-крэпасці, бясконцыя сцены і вежы, моцныя абарончыя збудаванні. «Луніды» рыхтуюцца да войнаў і даўно вядуць іх. Драздовіч нібыта адчувае напружанасць ў грамадстве, атмасферу будучай Другой сусветнай вайны. [3, с. 171]

Тэма космасу і касмічнага была ўласціва мастацтву канца XIX–пачатку XX стагоддзяў. Паралельна з Драздовічам тэму космасу распрацоўвалі літоўскі мастак Мікалоюс Чурлёніс і рускі мастак Пётр Фацееў. Менавіта на палотнах Чурлёніса будучы мастак убачыў мастацкае ўвасабленне касмічнай прасторы, і гэта ўражанне ў выніку і прывяло Драздовіча да ўласнага касмічнага мастацтва. Агульная рыса касмічнай творчасці усіх гэтых мастакоў заключана ў тым, што яны стварaлі не асобныя палотны, а цэлыя цыклы работ, аб’яднаныя адной тэмай. Калі параўнаць творчасць Чурлёніса, Фацеева і Драздовіча, то бачна, што першыя, у адрозненні ад Драздовіча, карысталіся сімвалічна-алегарычнымі вобразамі. Касмічныя палотны жа Драздовіча вылучаюцца сваёй дакладнасцю, у іх не так шмат сімвалізму. Зноў жа, гэта звязана з тым, што космас Драздовіча меў пад сабой аснову – «касмічныя візіі» і ўласныя навуковыя погляды. Усё яго мастацтва – гэта візуалізацыя ўласных поглядаў наконт іншапланетнага жыцця; праз мастацтва Драздовіч імкнецца як мага дакладней перадаць свае навуковыя погляды, каб чалавецтва ў будучым магло выкарыстоўваць іх на практыцы, бо мастак верыў у праўдзівасць сваіх візій. У дзённіках мастак піша, што робіць усё гэта дзеля навукі.

Жанр мастацтва Драздовіча можна вызначыць як «касмічны рэалізм» з беларускай спецыфікай. Луніды карыстаюцца печамі і апранаюць наміткі, сатурняне носяць белыя ільныныя сарочкі і маюць доўгую бараду (рыс. 1). Нібы добры чараўнік, мастак стварае на Месяцы, Марсе, Сатурне штучныя моры і даліны ўрадлівасці, вазводзіць велічныя архітэктурныя збудаванні і нават цэлыя гарады. Але па сваёй сутнасці ўсё гэта адлюстроўвае тое, што мастак на Зямлі змерыў уздоўж і поперак. «Падкружніковы краявід на планеце Сатурн» не мог узнікнуць без эмацыйнага ўздзеяння на мастака велічнага Гальшанскага гарадзішча, а месячныя гарады-крэпасці нагадваюць замкі эпохі

сярэднявечча. Драздовіч стварыў касмічную эру ў светапоглядзе беларускага народа.



*Рыс. 1.* Сустрэча вясны на Сатурне. 1932

Такім чынам, Язэп Драздовіч стаў першым у Беларусі, хто пачаў маляваць камічную прастору. Адметнай рысай творчасці Драздовіча з'яўляецца неразрыўнасць яго мастацтва і навуковых пошукаў. Да сённяшняга часу не было створана аналагаў яго яскравага касмічнага жывапісу, а навуковыя тэзісы мастака, хоць і большасць з іх сучаснай навукай не падцвярджаецца, з'яўляюцца ўнікальнымі астранамічнымі работамі на беларускай мове. Дзякуючы шматграннасці постаці Драздовіча, цікавасць да да яго асобы і творчасці не губляе сваёй актуальнасці і сёння. Я лічу, што імя мастака варта і мае ўсе шансы стаць своеасабовым брэндам нашай краіны.

**Літаратура**


1. *Вакар Л.* Арыенталізм у творчасці Я. Драздовіча// Язэп Драздовіч: «Прыйдзе час…» Зборнік матэрыялаў, прысвечаны 120-годдзю з дня нараджэння мастака/ Пад рэд. М. Цыбульскага – Смаленск: 2008. – с.22-27
2. *Каржанеўская Г.* Космас Драздовіча: ява і сны// Язэп Драздовіч: праз церні да зорак: успаміны, артыкулы, прысвячэнні, мастацкія творы/ уклад. Міхася Казлоўскага. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2014. – с. 95-98
3. *Усава Н.* Касмагонія Язэпа Драздовіча// Язэп Драздовіч: «Прыйдзе час…» Зборнік матэрыялаў, прысвечаны 120-годдзю з дня нараджэння мастака/ Пад рэд. М. Цыбульскага – Смаленск: 2008. – с.166-173